# СКАНВОРД




**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ**

**Па гарызанталі:** Адсадак. Тыгр. Арка. Турнэ. Кекс. Тры. Жар. Прараб. Гар. Анучa. Карніз. Ток. Асака. Засаб. Аул. Ліман. Кут. **Па вертыкалі:** Джыцу. Аўран. Алёк. Рэтра. Акын. Рожа. Кабачок. Арэнда. Ржа. База. Гута. Рака. Казуля. Салат. Сума. Банк.

**Склаў**
**Юрый ФАЛІНСКІ,**
*г. Мінск.*

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 6.21 | 19.55 | 13.34 |
| Віцебск — | 6.09 | 19.47 | 13.38 |
| Магілёў — | 6.11 | 19.45 | 13.34 |
| Гомель — | 6.11 | 19.40 | 13.29 |
| Гродна — | 6.37 | 20.10 | 13.33 |
| Брэст — | 6.40 | 20.08 | 13.28 |

## Месяц

*Апошняя квадра 30 жніўня.*
*Месяц у сузор'і Льва.*

## Імяніны

*Пр. Васы, Абрама, Агапія, Аляксандра, Паўла, Фадзея.*
*К. Ізабелы, Рыгора, Шымана, Яўхіма.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЗАЎТРА




# Даты | Падзеі | Людзі

**3 ВЕРАСНЯ**

**У краіне**

**1731** год — нарадзіўся (в. Занкі, цяпер у Свіслацкім раёне) Станіслаў Іванавіч Богуш-Сестранцэвіч, беларускі вучоны, літаратар, царкоўны і грамадскі дзеяч. Атрымаў адукацыю ва ўніверсітэтах Кёнігсберга, Франкфурта, Амстэрдама, Лондана. Служыў афіцэрам у прускім гусарскім палку і драгунскім палку Літоўскай гвардыі. У 1761 годзе выйшаў у адстаўку і служыў выхавальнікам у сям'і Радзівілаў. З 1773 года — кіраўнік Беларускай каталіцкай епархіі (цэнтр у Магілёве), з 1798-га — мітрапаліт усіх рымска-каталіцкіх касцёлаў у Расійскай імперыі. Пачынаючы з 1813 года — прэзідэнт Вольнага эканамічнага таварыства, член Расійскай АН. Вывучаў Беларусь, праблемы паходжання славян, змагаўся з езуітамі, прапагандаваў ідэі асветы, гуманізму. Арганізаваў у Магілёве друкарню. Аўтар гістарычных прац «Гісторыя сарматаў і славян», «Гісторыя Таўрыды», вершаў, дыдактычных твораў.

**1901** год — нарадзіўся (в. Старая Зяньковіна, цяпер у Кармянскім раёне) Пётр Ціханавіч Бандарэнка, савецкі ваенны дзеяч, контр-адмірал. З 1939 года — начальнік палітычнага ўпраўлення Чарнаморскага флоту. У гады Вялікай Айчыннай вайны ўдзельнік абароны Адэсы, Ачакава, Севастопаля. З 1942 года ў Волжскай ваеннай флатыліі, удзельнік Сталінградскай бітвы з першага да апошняга дня, з 1944-га — на Каспійскай флатыліі, з 1947 года намеснік камандуючага Чарнаморскім флотам. У 1949 годзе арыштаваны, прыгавораны да расстрэлу. Рэабілітаваны ў 1954 годзе.

**У свеце**

**301** год — заснавана Сан-Марына — найстарэйшая на сёння дзяржава Еўропы.

**1189** год — Рычард Ільвінае Сэрца каранаваны на англійскі каралеўскі прастол як Рычард І.

**1783** год — падпісаны Версальскі мірны дагавор. Вялікабрытанія прызнала незалежнасць ЗША.

**1864** год — выбух знішчыў Стакгольмскую лабараторыю Альфрэда Нобеля, дзе ён разам з бацькам праводзіў свае вопыты з нітрагліцэрынам. Загінулі пяць памочнікаў і малодшы брат Альфрэда — Эміль. Бацьку ад гора разбіў удар. Але Альфрэд свае вопыты не спыніў і праз тры гады атрымаў патэнт на выраб дынаміту.

**1866** год — у Жэневе адкрыўся Першы кангрэс І Інтэрнацыянала.

**1939** год — Вялікабрытанія, Францыя, Індыя, Аўстралія і Новая Зеландыя абвясцілі вайну фашысцкай Германіі.



**1953** год — М.С.Хрушчоў абраны першым сакратаром ЦК КПСС.

**1967** год — «Дзень Н»: Швецыя перайшла на правабаковы рух.

**Так гаварыў...**

**ЖАН-ЖАК РУСО**

*«Няма нічога больш згубнага, чым уплыў прыватных інтарэсаў на грамадскія справы».*




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, праспр. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 2343.

Нумар падпісаны ў 19.30 2 верасня 2021 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12